Culture & Creativity

EU-Eastern Partnership Programme




# ІНФАРМАЦЫЙНЫ БЮЛЕТЭНЬ ПРА РОЛЮ ІНДУСТРЫІ КУЛЬТУРЫ І ТВОРЧАСЦІ



Праграма фінансуецца
Еўрапейскім Саюзам

# Эканамічны ўплыў крэатыўных галін

Прыбытак індустрыі культуры і творчасці (ІКТ) склаў 535,9 млрд еўра, г.зн. 4,2% ВУП Еўрапейскага Саюза. Гэта галіна з'яўляецца трэцім па велічыні працадаўцам пасля будаўніцтва і прадпрыемстваў харчавання, такіх як бары і рэстараны. [1]

Трыма найбуйнейшымі напрамкамі дзейнасці ў 2012 годзе сталі выяўленчае мастацтва (127 млрд еўра), рэклама (93 млрд еўра) і тэлебачанне (90 млрд еўра), на долю якіх прыйшлося больш за палову ІКТ. У той жа час сукупны даход выдавецкай справы - газет, часопісаў і кніг - склаў 107 млрд еўра. [1]

Віды дзейнасці, якія моцна залежаць ад аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці, стымулююць рост еўрапейскай эканомікі і забяспечваюць 38,6% ВУП ЕС. Цесна звязаныя з аўтарскім правам віды дзейнасці, прадстаўленыя 11 сектарамі крэатыўных галін, склалі 4,2% ад ВУП ЕС ў 2012 годзе. [1]

Крэатыўныя галіны Вялікабрытаніі прыносяць даход у 9,6 млн фунтаў стэрлінгаў кожную гадзіну. [2]

Крэатыўныя галіны Вялікабрытаніі прыносяць эканоміцы 71,4 млрд фунтаў стэрлінгаў у год і даюць 1,68 млн працоўных месцаў. Па самых нядаўніх ацэнках гэтыя паказчыкі склалі 84,1 млрд фунтаў стэрлінгаў у год і 1,9 млн працоўных месцаў. [2]

Апошнія статыстычныя дадзеныя паказваюць, што індустрыя культуры і творчасці расце на 8,6% у год, што робіць яе другой самай хуткарослай прамысловай галіной у Вялікабрытаніі. [2]

За кожны фунт, укладзены ў вобласць культуры і мастацтва, эканоміка атрымлівае дадатковыя 1,06 фунтаў. [6]

***Фінансы для росту***

Поспехі ўключаюць у сябе стварэнне кампаніяй «Эдж Інвестментс» (Edge Investments) пры падтрымцы «Брытанскага Бізнэс-Банка» (British Business Bank) 40-мільённага інвестыцыйнага фонду для канкрэтных крэатыўных галін. [2]

Экспарт паслуг крэатыўных галін у 2014 годзе дасягнуў 19,8 млрд фунтаў стэрлінгаў, што склала 9% ад агульнага аб'ёму экспарту паслуг у Вялікабрытаніі. [2]

# Занятасць

Больш за 7 млн еўрапейцаў, г.зн. 3,3% актыўнага насельніцтва ЕС, прама ці ўскосна заняты ў крэатыўнай і культурнай дзейнасці. [1]

Найбуйнейшымі працадаўцамі ў ІКТ Еўропы сталі выяўленчае, выканаўчае мастацтвы і музычная індустрыя. На іх долю прыйшлося каля паловы працоўных месцаў (7 млн) ІКТ у ЕС у 2012 годзе. У сферы выканаўчага мастацтва (1 234,5 тыс.), выяўленчага мастацтва (1 231,5 тыс.) і музыкі (1 168 тыс.) занята больш за 1 млн чалавек. Затым ідуць рэклама (818 тыс.), кнігі (646 тыс.) і кіно (641 тыс.). [1]

У ІКТ у ЕС занята столькі ж людзей, колькі і ў прадпрыемствах харчавання. Яна забяспечвае працай амаль у 2,5 разы больш людзей, чым аўтамабільная, і ў 5 разоў больш, чым хімічная прамысловасці. [1]

У сярэднім, у 2013 годзе ў сферы культуры і творчасці было занята больш 15-29-гадовых, чым у любой іншай галіне (19.1% ад агульнай колькасці занятых у ІКТ у параўнанні з 18,6% у астатняй часткі эканомікі). Ва Усходняй і Цэнтральнай Еўропе гэта тэндэнцыя яшчэ больш прыкметная: у сярэднім, маладыя людзі займаюць у крэатыўных галінах на 1,3% больш працоўных месцаў, чым у астатняй частцы эканомікі. [1]

У Вялікабрытаніі ўжо назіраецца высокі працэнт занятасці ў ІКТ - каля 24% працоўных месцаў, 87% з якіх прыпадае на высокакваліфікаваных спецыялістаў творчых прафесій, замена якіх робатамі ў будучыні малаверагодная. [7]

На 12 брытанскіх працоўных месцаў прыходзіцца больш за адно ў крэатыўных галінах, прычым у перыяд паміж 2013 і 2014 гадамі занятасць вырасла на 5% у параўнанні з павелічэннем колькасці працоўных месцаў на 2.1% у эканоміцы ў цэлым. [6]

Група «Музыка, выканаўчае і выяўленчае мастацтва» мела самую высокую долю самазанятасці работнікаў. Больш за 7 з кожных 10 работнікаў у гэтай групе былі самазанятымі. [3]

Група "Дызайн і мода» прадэманстравала самы вялікі працэнт росту занятасці ў крэатыўных галінах у перыяд паміж 2011 і 2013 гадамі (17,7%, ці 27 тыс. рабочых месцаў). [3]

***Этнічная і сацыякультурная разнастайнасць***

Каля 11,4% працоўных месцаў крэатыўных галін у Вялікабрытаніі былі запоўнены чарнаскурымі, азіяцкімі і іншымі этнічнымі меншасцямі (BAME). [2]

# Культура і лічбавыя тэхналогіі

Дзве з сямі асноўных катэгорый тавараў і паслуг, якія набываюцца ў Інтэрнэце, адносяцца да сферы культуры. Найбольш прадавальным прадуктам онлайн з'яўляюцца кнігі: 35% пакупнікоў ужо куплялі кнігі такім чынам. Білеты на канцэрты, фестывалі і ў тэатр займаюць сёмае месца: 25% онлайн-пакупнікоў наведваюць сайты месцаў правядзення мерапрыемстваў, а таксама старонкі іншых рознічных гандляроў білетамі. [1]

Спажыўцы ў ЕС ужо прывыклі слухаць музыку і радыё, глядзець тэлевізійныя праграмы і гуляць у гульні на мабільных прыладах. У сярэднім, яны марнуюць 70% свайго часу працы на планшэце, «спажываючы» прадукты крэатыўных галін. Яны таксама трацяць 50% свайго часу працы на смартфоне не на званкі, а на гульні, відэа, музыку і на прагляд старонак у Інтэрнэце. [1]

Еўрапейскія спажыўцы з'яўляюцца аднымі з самых «прасунутых» у інфармацыйных тэхналогіях у свеце. У Заходняй Еўропе знаходзяцца 197 млн карыстальнікаў смартфонаў (другі па канцэнтрацыі карыстальнікаў рэгіён у свеце), а 73,1% еўрапейцаў карыстаюцца Інтэрнэтам. [1]

Эканамічны ўплыў культурнага і крэатыўнага кантэнту на продаж смарт-прылад, якія падключаюцца, (ацэначнае ўскоснае ўздзеянне культурнага і крэатыўнага кантэнту (відэа, гульняў, музыкі і г.д.)):
*планшэты - 9,4 млрд еўра;*
*смартфоны - 22,27 млрд еўра;*
*ПК - 10,35 млрд еўра.* [1]

Група «IT, праграмнае забеспячэнне і камп'ютэрныя паслугі» стала самай вялікай групай, якая дала 825 тыс. працоўных месцаў для спецыялістаў крэатыўных галін у 2013 годзе. З 2011 года ў гэтай групе назіраўся рост на 16,4% (117 тыс. працоўных месцаў). [3]

У 2008 годзе каля 12% спажывецкіх выдаткаў на сродкі масавай інфармацыі і забаў былі накіраваны на лічбавыя прадукты і паслугі; як чакаецца, да 2017 года гэта лічба ўзрасце прыблізна на 50%. [5]

Лічбавыя тэхналогіі таксама набываюць усё большае значэнне для бізнэс-мадэляў у сферы культуры: у цяперашні час 51% мастацкіх і культурных арганізацый выкарыстоўваюць Інтэрнэт для атрымання новых патокаў даходаў (павелічэнне на 17% у параўнанні з 2013 годам). [5]

У 2012 годзе ў Вялікабрытаніі 200 млн фунтаў стэрлінгаў было інвесціравана з выкарыстаннем краудфандзінга, і, паводле ацэнак, у 2013 годзе 25% дарослага насельніцтва Вялікабрытаніі выкарыстоўвалі Інтэрнэт-тэхналогіі для сумеснага выкарыстання рэсурсаў і сродкаў.
У 73% з 947 апытаных культурных арганізацый Англіі заявілі, што лічбавая дзейнасць аказала значны станоўчы ўплыў на іх працу. [5]

У 51% апытаных мастацкіх і культурных арганізацый адзначылі, што лічбавыя тэхналогіі маюць важнае ці ключавое значэнне для іх бізнэс-мадэлі, і гэтыя арганізацыі з большай доляй верагоднасці будуць уцягнуты ў дзейнасць, якая прыносіць даход у Інтэрнэце, напрыклад, збор ахвяраванняў і краудфандзінг. [4]

Лічбавая рэвалюцыя ператтварае культуру гэтак жа, як яна ператтварае і іншыя аспекты нашага жыцця. Яна прыводзіць да павелічэння ўзроўню ўдзелу ў нефармальнай культурнай і творчай дзейнасці, стварэнню новых сетак і форм узаемадзеяння, ператтварае вытворчасць і размеркаванне наяўных відаў мастацтва і спрыяе ўзнікненню новых. [5]

# Выяўленчае мастацтва

Музеі граюць ключавую ролю ў дaступнасці выяўленчага мастацтва для ўсіх грамадзян. Сем самых наведвальных мастацкіх музеяў у свеце знаходзяцца ў Еўропе, прычым у Парыжы і Лондане знаходзяцца па тры. У 2012 годзе Луўр у Парыжы наведалі амаль 10 млн чалавек, а кожны з гэтых 7 музеяў прыняў больш за 3 млн наведвальнікаў, што пацвярджае масавую цікавасць у гэтых музеях як на нацыянальным, так і на міжнародным узроўнях. [1]

Удзельнічаючы ў адным з апытанняў, наведвальнікі некалькіх еўрапейскіх музеяў сказалі, што яны прыходзяць для забавы і задавальнення (28%), адукацыі і навучання (26%) і для сувязі з гісторыяй (17%). [1]

Еўропа - гэта глабальны цэнтр выяўленчага мастацтва і самы буйны арт-рынак у свеце. Доля ЕС (уключаючы Швейцарыю) на сусветным арт-рынку ў грашовым выражэнні складае 34%, што робіць яго сусветным лідэрам у галіне продажаў твораў мастацтва наперадзе Кітая (30%) і ЗША (29%). [1]

На Еўрапейскім арт-рынку дамінуе Вялікабрытанія (65% рынку ЕС); далей ідуць Францыя (17%) і Германія (5%). Лондан пацвярджае свой статус арт-сталіцы з глабальнай аўдыторыяй; фірма «Крысціз» (Christie's), якая базуецца ў Вялікабрытаніі, з'яўляецца вядучым у свеце аўкцыённым домам, абарот якога ў 2013 годзе, у тым ліку прыватныя продажы, склаў 7 млрд долараў. [1]

У 2016 годзе з ЕС было экспартавана твораў мастацтва і антыкварыяту на 6,2 млрд еўра, а імпартавана на 5 млрд еўра. Гэта адлюстроўвае стратэгічную ролю Еўропы як глабальнага цэнтра продажу твораў мастацтва. [1]

# Выканаўчае мастацтва

Сфера выканаўчага мастацтва забяспечыла Еўропе 1 234 338 працоўных месцаў (гэта значыць, больш аднаго на кожныя шэсць працоўных месцаў) і стала найбуйнейшым працадаўцам у індустрыі культуры і творчасці на кантыненце. [1]

Канцэрты і музычныя фестывалі ў 2011 годзе прынеслі больш за трэць (37%) сусветнага даходу ад выканаўчых відаў мастацтва. [1]

Паводле аднаго даследавання, больш за 45% апытаных назвалі еўрапейскі рынак фестываляў «здаровым», а 40% сказалі, што эканамічны крызіс не моцна паўплываў на іх планы інвестыцый і развіцця. [1]

Фестываль Sziget - гэта маштабны васьмідзённы музычны фестываль, які штогод праводзіцца ў Будапешце з 1993 года і прымае больш за 65 тыс. наведвальнікаў у дзень. Такія фестывалі пад адкрытым небам прадастаўляюць істотную колькасць працоўных месцаў, наймаючы ў асноўным маладых мясцовых жыхароў, добра падрыхтаваных і адукаваных. Гэтыя працоўныя месцы не могуць быць занятыя кімсьці з-за мяжы: што робіць нашу ролю яшчэ больш важнай на мясцовым узроўні. [1]

***Выканаўчае мастацтва і турызм***

Выканаўчае мастацтва грае важную ролю ў прыцягненні людзей, напрыклад, 9,2% турыстаў, якія наведваюць Вялікабрытанію, хадзілі ў тэатр, на мюзікл, оперу або балет. Мясцовыя выступленні ў парках, пабах, рэстаранах і нават на турбазах з'яўляюцца адным з найважнейшых элементаў турыстычнай прывабнасці Еўропы. [1]

Багатая культурная спадчына ў многіх еўрапейскіх краінах і сталіцах дапаўняецца дынамікай сучасных тэатраў і музыкі. [1]

У адной толькі Францыі культурны турызм прынёс 18 млрд еўра ў 2011 годзе; на яго прыйшлося 35% спажывецкіх рашэнняў турыстаў. [1]

У працягу 2011 года тэатральная аўдыторыя ў Барселоне, папулярнага еўрапейскага турыстычнага цэнтра, дасягнула рэкорднай адзнакі ў 2,8 мільёна чалавек. [1]

# Выдавецкая справа

Еўрапейскі выдавецкі сектар з'яўляецца найбуйнейшым у свеце, і сем з дзесяці найбуйнейшых кніжных выдавецтваў у свеце - еўрапейскія. [1]

Аб'ёмы продажаў кніжнага рынку склалі больш 36,3 мільярда еўра - істотны ўклад у крэатыўную эканоміку ЕС. Гэта пяты па велічыні рынак, які апераджае кінаіндустрыю і выканаўчае мастацтва. У ім занята амаль 650 тыс. чалавек па ўсёй Еўропе. Паводле ацэнак, у Еўропе налічваецца 150 тыс. аўтараў. [1]

***Часопісы і газеты***

Хоць у сектары часопісаў і газет занята менш за паўмільёна чалавек, яго агульны даход складае больш за 70 млрд еўра, што робіць яго чацвёртай па велічыні крэатыўнай галіной. Набытыя ў кіёску або краме на вуліцы або дастаўленыя па падпісцы газеты складаюць 60% ад агульнага аб'ёму продажаў. Палову даходаў выдаўцоў забяспечвае рэклама, якая гістарычна заўсёды была адным з найважнейшых элементаў іх бізнэс-мадэлі. [1]

Еўропа з'яўляецца найбуйнейшым рынкам газет і часопісаў у свеце. EU28 ужо даўно з'яўляецца лідэрам сярод сусветных рынкаў: у 2012 годзе на ім была прададзена амаль трэць часопісаў, больш ЗША (24%) і Японіі (11%). [1]

Два найбуйнейшых сусветных інфармацыйных агенцтваў, AFP і Reuters, былі створаны ў Еўропе. Шэраг найбольш паспяховых новых бізнэс-мадэляў таксама еўрапейскія: штотыднёвы навінавы часопіс Der Spiegel эфектыўна справіўся з пераходам на новыя платформы і лічбавы кантэнт. Вэб-выданне, у якім працуюць 60 журналістаў, чытаюць 5,6 млн унікальных наведвальнікаў кожны месяц, і, у адрозненне ад друкаванага выдання, сайт Der Spiegel прыносіць прыбытак з 2005 года. [1]

# Музычная індустрыя

Большая частка працуючых у музычнай індустрыі - амаль 1,2 млн чалавек - занята ў сферы напісання і выканання музычных твораў. Усяго зарэгістравана 650 тыс. музыкаў, кампазітараў і аўтараў песень. [1]

Еўрапейскі музычны рынак абумоўлены лічбавымі рынкамі, якія растуць. У перыяд з 2009 2013 гг. продажы музыкі, запісанай у лічбавых фарматах, выраслі ў Еўропе на 109%. [1]

Еўрапейцы застаюцца аднымі з найбуйнейшых у свеце спажыўцоў музычных запісаў, прычым у 2013 годзе 10 найбуйнейшых рынкаў па ўсім свеце ўключалі 4 краіны ЕС. Па дадзеных адной з галіновых арганізацый, Міжнароднай федэрацыі вытворцаў фанаграм і відэаграм (IFPI), у 2013 годзе лічбавыя продажы склалі 39% ад глабальных зарэгістраваных гандлёвых даходаў музыкі, і 32% гэтых продажаў адбыліся ў Еўропе. [1]

Аўтарскія адлічэнні, якія збіраюцца арганізацыямі па кіраванні правамі ў Еўропе складаюць 60% ад сусветных, прычым 2,8% з іх прыпадае на музычную індустрыю. [1]

Вырашальнае значэнне для поспеху еўрапейскай музычнай індустрыі мела прыняцце і стварэнне лічбавых бізнэс-мадэляў. Гуказапісвальныя кампаніі паспяхова прадаюць музыку праз лічбавыя каналы, пашыраючы свет ліцэнзаванай музыкі і ўкараняючы новаўвядзенні з мэтай прадставіць музыкаў глабальнай аўдыторыі. [1]

Даход ад падпісак на струменевыя музычныя сэрвісы ў 2013 годзе вырас на 51,3%, упершыню перавысіўшы 1 млрд долараў. (каля 750 млн еўра) ва ўсім свеце. [1]

У апошнія некалькі гадоў у Еўропе надзвычай вырасла папулярнасць музычных онлайн-сэрвісаў. Да 2013 года ў Еўропе былі даступны больш за 230 музычных сэрвісаў, якія прапануюць больш за 37 млн трэкаў у кожнай краіне ЕС. Лічбавыя продажы ў 2013 годзе склалі 32% ад еўрапейскіх продажаў музычных запісаў, у той час як фізічныя продажы склалі 56%. [1]

# Кінаіндустрыя

Гэты рынак коштам 17 млрд еўра дае працоўныя месцы амаль 650 тыс. чалавек. Яго найбуйнейшай крыніцай даходаў з'яўляецца продаж білетаў у кіно, т.зв. валавыя касавыя зборы, на якія прыходзіцца 36,5% ад агульнага аб'ёму даходаў у 2012 годзе. [1]

Вялікабрытанія мае трэцюю па велічыні кінаіндустрыю ў свеце. Фільмы, знятыя ў Вялікабрытаніі, зарабілі 4,1 млрд фунтаў стэрлінгаў, што складае 11,4% сусветнага рынку. Зборы незалежных фільмаў Вялікабрытаніі склалі 1,6% сусветнага рынку (больш за 64 млн фунтаў стэрлінгаў). Доля рынку брытанскіх фільмаў у Еўропе вагаецца ад 10% да 16%. У 2012 годзе ў эканоміцы Вялікабрытаніі на кіно, ТБ, відэа і г.д. прыйшлося 9,8 млрд фунтаў стэрлінгаў валавога дабаўленага кошту. [1]

Валавыя касавыя зборы брытанскіх фільмаў па ўсім свеце склалі 4,1 млрд. долараў ЗША, г.зн. 11% ад глабальных касавых збораў. Група «Кінематограф, тэлебачанне, відэа, радыё і фатаграфія» прадэманстравала трэці па велічыні працэнт росту занятасці ў крэатыўных галінах у перыяд паміж 2011 і 2013 гадамі (11,8% ці 27 тыс. працоўных месцаў). [5]

Сукупныя валавыя касавыя зборы гэтых фільмаў склалі 773 млн фунтаў стэрлінгаў толькі ад брытанскай аўдыторыі. [5]

# Архітэктура

У Еўропе зарэгістравана амаль паўмільёна архітэктараў, а даходы ад архітэктурнай дзейнасці дасягаюць 36 млрд еўра. Архітэктурныя віды дзейнасці з'яўляюцца важнай часткай крэатыўнай эканомікі Еўропы. [1]

# Рэклама

Рэкламны бізнэс з'яўляецца важнай часткай індустрыі культуры і творчасці: яго даходы ў 2012 годзе склалі 93 млрд еўра, і ён падаў 820 тыс. працоўных месцаў. Рэкламны бізнэс генеруе каля 17% ад агульных даходаў ІКТ, з'яўляючыся другой па велічыні галіной пасля выяўленчага мастацтва. [1]

У Еўропе знаходзяцца дзве з трох найбуйнейшых Медыягруп у свеце: WPP Group, якая базуецца ў Лондане, і «Публісіс Груп» (Publicis Groupe), якая базуецца ў Парыжы, іх абарот складае 16,4 і 8,5 млрд еўра, адпаведна. [1]

# Радыё

У 2012 годзе радыё было другім найбольш шырока выкарыстоўваемым еўрапейскімі спажыўцамі сродкам масавай інфармацыі пасля тэлебачання. Чатыры з пяці еўрапейцаў слухаюць радыё на працягу двух або больш гадзін штодня. Даходы галіны складаюць 10 млрд еўра; яна забяспечвае 97 тыс. працоўных месцаў. [1]

# Камп’ютэрныя гульні

Індустрыя камп'ютэрных гульняў забяспечвае крыху больш за 100 тыс. працоўных месцаў, а яе даход складае 16 млрд еўра ў год, што яе робіць маладой галіной, якая ахоплівае ўвесь свет. [1]

Штогадовы экспарт за межы Еўропы складае амаль 3 млрд еўра, г.зн. камп'ютэрныя гульні з'яўляюцца найбольш прадавальным культурным прадуктам Еўропы. [1]

# Культурнае жыццё грамадства і грамадзянская актыўнасць

Розныя даследаванні паказваюць на працэсы, з дапамогай якіх культурнае ўзаемадзеянне дапамагае ўмацаваць жаданне маладых людзей удзельнічаць у палітычнай актыўнасці, грамадскае мастацтва адлюстроўвае жыццё насельніцтва і яго будучыню, а групы меншасцей знаходзяць калектыўны голас, самавызначэнне і прызнанне. [4]

Людзі, занятыя ў мастацтве, удзельнічаюць у грамадскай дзейнасці значна больш актыўна, чым тыя, хто ў іх не задзейнічаны. «Згодна з мадэллю верагоднасць таго, што наведвальнікі мерапрыемстваў выканаўчага мастацтва будуць удзельнічаць у валанцёрскіх ініцыятывах, у 3,8 разы больш, чым у выпадку з тымі, хто такія мерапрыемствы не наведвае, незалежна ад іх узроўню адукацыі, полу, а таксама іншых асобных дэмаграфічных характарыстык». Аналагічныя вынікі былі атрыманы ў дачыненні да карэляцыі паміж занятасцю ў мастацтве і грамадскімі сходамі. Розніца ва ўзроўнях грамадзянскай актыўнасці паміж аўтарамі і выканаўцамі твораў мастацтва і простымі наведвальнікамі была яшчэ больш. [4]

На прэзідэнцкіх выбарах 2004 года ў ЗША прагаласавалі толькі 1% маладых людзей з нізкім сацыяльна-эканамічным статусам і нізкім узроўнем удзелу ў культурным жыцці і 45% людзей з тым жа сацыяльна-эканамічным статусам, але з высокім узроўнем удзелу ў культурным жыцці. [4]



# Культура і міратворчая дзейнасць

Мастацтва і культурныя мерапрыемствы дапамагаюць пабудаваць свет і аднавіць жыццё пасля ўзброеных канфліктаў, дапамагаючы жыхарам справіцца з крыніцамі траўмы і дасягнуць прымірэння. [4]

Мастацтва можа дапамагчы людзям справіцца з крыніцамі траўм, дасягнуць прымірэння і рухацца далей. Мастацтва грае вельмі важную ролю ў пашырэнні вопыту людзей і прадастаўленні больш нейтральнага пункту гледжання ў параўнанні са звычайным палітычным дыялогам. Гэта роля можа адначасова заключацца ў навядзенні мастоў паміж некалі варагуючымі групамі людзей (чаму аддаюць перавагу спонсары) і адлюстраванні ўнутранага досведу груп, па-ранейшаму пакутуюць ад траўм (што можа мець гэтак жа важнае значэнне). [4]

Мастацтва можа ствараць альтэрнатыўныя, часта бяспечныя магчымасці, каб аднавіць памяць, прагаварыць свой погляд на падзеі і прадставіць новыя формы ўзаемаадносін і разумення. [4]


1. http://www.ey.com/Publication/vwLUAssets/Measuring_cultural_and_creative_markets_in_the_EU/$FILE/Creating-Growth.pdf

**Крэатыўны рост. Ацэнка культурных і крэатыўных рынкаў у ЕС. Снежань, 2014 г.**

2. http://www.thecreativeindustries.co.uk/media/367095/final-version-july-5.pdf

**Ствараем разам.**
**Стратэгія міжгаліновага супрацоўніцтва Савета крэатыўных галін.**

3. http://www.thecreativeindustries.co.uk/media/281787/creative_industries_economic_estimates_-_january_2015.pdf

**Эканамічная ацэнка крэатыўных галін. Статыстычныя дадзеныя. Студзень, 2015 г.**

4. http://www.ahrc.ac.uk/documents/publications/cultural-value-project-final-report/

**Разуменне каштоўнасці мастацтва і культуры.**
**Праект Савета Вялікабрытаніі па мастацтву і гуманітарных навуках у сферы культурных каштоўнасцей. 2016 г.**

5. http://www2.warwick.ac.uk/research/warwickcommission/futureculture/finalreport/warwick_commission_report_2015.pdf

**Узбагачэнне Вялікабрытаніі: культура, творчасць і рост.**
**Справаздача Уорыкскай камісіі пра будучыню культурных каштоўнасцей за 2015 г.**

6. https://www.theguardian.com/culture/2015/jul/13/publicly-funded-arts-bolster-the-uk-economy-study-finds

**Даследаванні даказалі, што дзяржаўнае фінансаванне мастацтва ўмацоўвае эканоміку Вялікабрытаніі. Ліпень, 2015 г.**

7. http://www.creativeindustriesfederation.com/assets/userfiles/files/CIF_EduAgenda_spreads.pdf

**Праграма крэатыўнай адукацыі Федэрацыі крэатыўных галін.**